БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ПЛАТФОРМА
ФОРУМУ ГРАМАДЗЯНСКАЙ СУПОЛЬНАСЦІ УСХОДНЯГА ПАРТНЁРСТВА

Менск 19.08.2020

# Зварот

**Беларускай Нацыянальнай платформы Форуму грамадзянскай супольнасці Усходняга партнёрства**

**з нагоды сітуацыі з Купалаўскім тэатрам**

Мы, прадстаўнікі Беларускай Нацыянальнай платформы ФГС Усходняга партнёрства, выказваем адназначную падтрымку дырэктару Паўлу Латушку і калектыву Нацыянальнага акадэмічнага тэатру імя Янкі Купалы.

13 жніўня калектыў Купалаўскага тэатру запатрабаваў спыніць гвалт над мірнымі грамадзянамі, якія выйшлі на вуліцы, не пагадзіўшыся з вынікамі, абвешчанымі ЦВК па выніках выбараў прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, і выступіў за пералік галасоў з удзелам незалежных назіральнікаў.

14 жніўня Павел Латушка, дырэктар Купалаўскага тэатру, выйшаў на плошчу Незалежнасці да ўдзельнікаў мірнай акцыі і заявіў, што кіраўнік МУС Беларусі і іншыя асобы, адказныя за жорсткае абыходжанне з затрыманымі, павінны сысці ў адстаўку.

Разам з іншымі дзеячамі культуры і мастацтва купалаўцы запісалі адкрыты зварот да беларускіх грамадзянаў і арміі, падрыхтавалі некалькі відэа, а пазней заявілі, што тэатр гатовы да страйку. Над тэатрам быў вывешаны бел-чырвона-белы сцяг. Калі ўлады запатрабавалі ад купалаўцаў зняць сцяг, яны адмовіліся.

17 жніўня Павел Латушка быў звольнены ў пасады дырэктара Купалаўскага тэатру па артыкуле 259 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (па рашэнню ўласніка маёмасці арганізацыі, без якіх-небудзь далейшых тлумачэнняў). Купалаўскі тэатр з'яўляецца дзяржаўным тэатрам і падпарадкоўваецца Міністэрству культуры Беларусі. Але Павел Латушка не парушыў закон, ён адкрыта выказаў сваю грамадзянскую пазіцыю.

Большасць актораў тэатру падалі заявы аб сыходзе ў знак пратэсту супраць звальнення дырэктара.

Падтрымку рэжысёру і калектыву выбітнага беларускага тэатру выказалі не толькі яго галоўны рэжысёр, акторы, іншыя супрацоўнікі, але і прадстаўнікі іншых беларускіх тэатраў, дзеячы культуры, грамадскасць, замежныя дзеячы культуры.

У святле ўсіх гэтых фактаў, мы, удзельнікі Беларускай нацыянальнай платформы ФГС УП, заяўляем:

- звальненне Паўла Латушкі з пасады дырэктара тэатру за выраз яго грамадзянскай пазіцыі з'яўляецца палітычна матываваным і наносяць шкоду не толькі самому тэатру, але і беларускай культуры цалкам. Такім чынам дзеячаў культуры спрабуюць пазбавіць уласнага голасу і права быць салідарнымі са сваім народам, адгукацца на выклікі сучаснасці, запыты і боль свайго гледача.

- міністру культуры Юрыю Бондару варта сысці ў адстаўку, паколькі ў цяжкія для беларускага народу дні ён палічыў за лепшае заплюшчыць вочы на хлусню і гвалт, якія робяцца адным з самых непрывабных палітычных рэжымаў нашага часу.

- мы выказваем падтрымку Паўлу Латушку, выдатнаму калектыву Купалаўскага тэатру, нашым таленавітым рэжысёрам і акцёрам, якія зберагглі і развілі не толькі слаўныя традыцыі гэтага старэйшага і найвядомага тэатра, але і сам дух Купалы, які сваёй творчасцю абуджаў беларусаў у іх імкненні "людзьмі звацца».

Мы спадзяемся, што і тэатр, і сам спадар Латушка вельмі хутка змогуць вярнуцца да творчай ці кіраўнічай працы у вольнай Беларусі!